# Практыкум па раздзеле «Беларусь і свет у другой палове 1940-х — пачатку 1990-х гг.»

## Выяўленне заканамернасці і выпадковасці

**1.** Найважнейшай з'явай другой паловы XX ст., якая шмат у чым вызначыла развіццё сучаснага грамадства, была навукова-тэхнічная рэвалюцыя. Яна змяніла вытворчасць і паўсядзённае жыццё чалавека.

Падчас навукова-тэхнічнай рэвалюцыі адбываецца працэс ператварэння навукі ў непасрэдную прадукцыйную сілу. НТР змяняе ўмовы, характар і змест працы, структуру прадукцыйных сіл, галіновую і прафесійную структуру грамадства, вядзе да хуткага росту прадукцыйнасці працы, уздзейнічае на ўсе бакі жыцця грамадства, у тым ліку на культуру, побыт, псіхалогію людзей, узаемаадносіны грамадства з прыродай.

Найважнейшую ролю ў падрыхтоўцы НТР адыгралі поспехі прыродазнаўства ў канцы XIX — пачатку XX ст., у выніку якіх склалася новая карціна свету. Гэты пераварот пачаўся з адкрыцця электрона, радыю, ператварэння хімічных элементаў, стварэння тэорыі адноснасці і квантавай тэорыі. Рэвалюцыйны зрух адбыўся ў тэхніцы, у першую чаргу пад уплывам выкарыстання электрычнасці ў прамысловасці і на транспарце. Было вынайдзена радыё і атрымала вялікае пашырэнне. У 40-я гг. XX ст. навука вырашыла праблему расшчаплення атамнага ядра, чалавецтва авалодала атамнай энергіяй.

Пачаўся рост асігнаванняў на навуку. Навуковая дзейнасць ператварылася ў масавую прафесію. У другой палове 50-х гг. XX ст. у многіх краінах пачалося стварэнне тэхнапаркаў, дзейнасць якіх скіравана на планаванне і кіраванне навуковай дзейнасцю. Узмацніліся непасрэдныя сувязі паміж навуковымі і тэхнічнымі распрацоўкамі, паскорылася выкарыстанне навуковых дасягненняў у вытворчасці.

А. Вызначце істотныя прыкметы паняцця «навукова-тэхнічная рэвалюцыя».

Б. Укажыце ключавыя змены, што адбыліся ў розных сферах жыцця грамадства ў выніку НТР. Канкрэтызуйце вылучаныя змены гістарычнымі фактамі з гісторыі Беларусі.

В. Зрабіце вывад, ці была НТР заканамернай з'явай.

## Адрозненне факта ад думкі

**2.** «На момант перабудовы БССР была адной з найбольш развітых савецкіх рэспублік. У 1991-м паводле індэксу развіцця чалавечага патэнцыялу Беларусь займала 40-е месца сярод 174 краін свету і належала даг руппы краін з высокім узроўнем развіцця. ...ВУП на душу насельніцтва паводле парытэту пакупніцкай здольнасці ў доларах ЗША ў 1989 г. складаў: РСФСР — 10 326; Украінская ССР — 9303; Італія — 15 500; Іспанія — 10 500; БССР — 14 980». *(У. Г. Гусакоў, акадэмік НАН Рэспублікі Беларусь. «Беларусь сегодня», 2021 г.)*

**Сярэднегадавыя тэмпы эканамічнага росту ў СССР і БССР у 1970–1985 гг. (%)**

| | | 1970–1975 гг. | 1976–1980 гг. | 1981–1985 гг. |
|---|---|---|---|---|
| 1. ВНП (валавы нацыянальны прадукт) | СССР<br>БССР | 6,3<br>8,3 | 4,2<br>5,2 | 3,5<br>5,0 |
| 2. Прамысловая прадукцыя | СССР<br>БССР | 7,4<br>10,4 | 4,4<br>7,2 | 3,7<br>5,4 |
| 3. Прадукцыя сельскай гаспадаркі | СССР<br>БССР | 2,5<br>2,6 | 1,7<br>1,5 | 1,1<br>1,6 |

А. Што такое перабудова? Калі яна пачалася?

Б. Вызначце тэндэнцыі ў эканамічным развіцці СССР і БССР у 1970–1985 гг. Чым яны былі абумоўлены?

В. Падмацуйце фактамі думку пра тое, што да пачатку перабудовы БССР была адной з самых развітых савецкіх рэспублік.

## Вызначэнне ролі асобы ў гісторыі

**3.** А. Выканайце заданне на выбар.

1. Складзіце топ-5 «Асоба ў гісторыі ў другой палове 1940-х — пачатку 1990-х гг.». Свой выбар аргументуйце.

2. Зрабіце постар, прысвечаны пэўнай асобе і яе ролі ў гісторыі.

3. Складзіце аповед ад імя пэўнай асобы аб гістарычных падзеях, у якіх яна брала ўдзел.

Б. Вызначце трох асоб, якія зрабілі найбольшы ўнёсак у развіццё Беларусі ў другой палове 1940-х — пачатку 1990-х гг. Сваю думку аргументуйце.

## Ажыццяўленне пошуку інфармацыі

**4.** Разгледзьце плакаты. Выканайце заданні.




*І. Ганф.*
*«Народы свету не хочуць паўтарэння бедстваў вайны. І. Сталін». 1949 г.*




*М. Гардон.*
*«Айчыну я слаўлю, якая ёсць, ды тройчы — якая будзе». 1957 г.*




*А. Какарэкін.*
*«Вугаль — гэта хлеб для прамысловасці!». 1946 г.*




*Б. Белапольскі.*
*«Добры дагляд — высокія надоі!». 1955 г.*




*Н. Вігілянская.*
*«Нас, піянераў-сяброў, мільёны!». 1962 г.*




*Б. Старыс.*
*«Казка зрабілася быллю». 1961 г.*

А. Суаднясіце час стварэння плаката і гістарычныя падзеі, што адбываліся ў гэты перыяд у свеце, у СССР і БССР.

Б. Якія асаблівасці / тэндэнцыі развіцця СССР і БССР знайшлі ўвасабленне ў сюжэтах плакатаў?

В. Плакаты ствараюцца з мэтай інфармавання, рэкламы, агітацыі. Плакат — гэта зведзенае ў выразную візуальную формулу паведамленне, прызначанае сучасніку для вывадаў і канкрэтных дзеянняў. З якой мэтай былі выраблены паказаныя плакаты?

## Выяўленне прычынна-выніковых сувязей

5. У другой палове XX ст. актывізавалася міжнародная дзейнасць БССР. Наша рэспубліка зрабілася адной з краін — заснавальніц ААН, брала ўдзел у рабоце амаль 70 міжнародных арганізацый і іх органаў. У 1954 г. яна зрабілася членам Міжнароднай арганізацыі працы і ЮНЕСКА, у 1957 г. — МАГАТЭ, у 1974 г. — Сусветнай арганізацыі інтэлектуальнай уласнасці, у 1985 г. — Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па прамысловым развіцці (ЮНІДО). У 1974–1975 гг. БССР была непастаянным членам Савета Бяспекі ААН.

БССР падпісала шэраг важных дамоў, якія абмяжоўвалі гонку ўзбраенняў:

- аб забароне выпрабаванняў ядзернай зброі ў атмасферы, касмічнай прасторы і пад вадой (1963);
- аб прынцыпах дзейнасці дзяржаў па даследаванні і выкарыстанні касмічнай прасторы (1967);
- аб забароне размяшчэння на дне мораў і акіянаў і ў іх нетрах ядзернай зброі (1971);
- аб забароне распрацоўкі, вытворчасці і назапашвання бактэрыялагічнага (біялагічнага) і таксічнага ўзбраення і яго знішчэнні (1972).

Важным кірункам дзейнасці дэлегацыі БССР у ААН была барацьба супраць каланіялізму. Наша рэспубліка была ў ліку ініцыятараў прыняцця Дэкларацыі аб наданні незалежнасці каланіяльным краінам і народам (1960), паслядоўна выступала за поўнае ажыццяўленне яе прынцыпаў.

А. Чым было абумоўлена павышэнне міжнароднага статусу БССР у другой палове XX ст.?

Б. Вызначце гістарычныя падзеі, з'явы і працэсы другой паловы XX ст., якія абумовілі кірункі дзейнасці БССР у ААН.